■ Фотаздымак з гісторыяй

# А ПАМЯЦЬ ЗАСТАЕЦЦА

«Піша вам пастаянная чытачка газеты Карпук Антаніна Міхайлаўна, жыхарка горада Нясвіжа Мінскай вобласці. Мне вельмі спадабалася рубрыка «Фотаздымак з гісторыяй», і я вырашыла таксама напісаць.

Пасля смерці маёй стрыечнай сястры я разбірала яе сямейныя фотаздымкі і знайшла даволі даўнія. На адным з іх — вяселле маёй цётачкі Стэфы і яе мужа Канстанціна Астроўскіх. Усе прысутныя тут — маладыя жыхары вёскі Слаўкава Нясвіжскага раёна. Па словах майго бацькі, яго маці, а мая бабуля Эфка, вельмі рана засталася ўдавой з чатырма дзецьмі. І вельмі цяжка было ў той час (а гэта было ў пачатку ХХ стагоддзя) гадаваць адной дзяцей. Таму, каб наладзіць вяселле сваёй дачцэ Стэфе, бабка ўлезла ў вялікія запазычванні. Але гэта, мусіць, каштавала таго. Бо гледзячы на такіх маладых, прыгожых, сціскаецца сэрца ад замілавання. Яны кахалі, жаніліся, прыбіраліся ў вясельныя ўборы — і ўсё гэта нягледзячы на нястачу.



Вельмі хочацца, каб, глянуўшы на гэты фотаздымак, хтосьці з блізкіх ці знаёмых пазнаў сваіх родзічаў або проста ўспомніў, што калісьці гэтыя людзі жылі ў вёсцы Слаўкава. Бо памяць — гэта галоўнае.

На другім фотаздымку мой татачка, Шыкула Міхаіл Юльянавіч, жыхар вёскі Слаўкава. Я не ведаю, дзе ён фатаграфаваўся, і ці не форма гэта салдата польскай арміі... Ведаю толькі, што мой татачка ваяваў у Войску Польскім, у другім стралковым палку. Дайшоў з баямі да Берліна, меў узнагароды.

У мірны час многа працаваў, любіў сваю Радзіму. А найлепшай песняй лічыў «Люблю наш край, старонку гэту». Заўсёды, калі яна гучала, у яго на вачах блішчэлі слёзы.

Памёр мой татачка на 93-ім годзе жыцця, пасля сарака дзён са смерці сваёй жонкі і маёй матулі.

Я магу бясконца гаварыць пра свайго роднага чалавека, таму ў памяць аб ім я і мой сын назвалі яго імем аграсядзібу». ■



***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***

■ Майстар-клас

# Як зрабіць крэйдачкі для малявання на асфальце?



**Вы ідзяце на дзень нараджэння да сяброў, у якіх маленькія дзеткі? І не ведаеце, чым іх здзівіць? Ёсць ідэя! Падарыце бацькам і іх дзеткам новыя ўражанні. Напрыклад, які-небудзь незвычайны майстар-клас.**

Менавіта такі падарунак атрымала Аляксандра Сержановіч са сваімі дзеткамі Янам і Юстынай, якіх я сустрэла ў майстэрні «Святло керамікі». Мы разам у той вечар зрабілі шэсць вялізных крэйдачак. Дапамагала нам у гэтай неверагодна захапляльнай справе Хэлен Машчанка. Я з захапленнем назірала, як лёгка і нязмушана гэтая маладая дзяўчына знаходзіла падыход да дзетак.

Спачатку яна навучыла нас рабіць формачкі для будучых крэйдачак. Для гэтага раздала кожнаму па кардонным тубусе ад харчовай фольгі. Яго трэба было грунтоўна абматаць кавалкам шчыльнай плёнкі (такой звычайна ў вёсцы абцягваюць парнік). І добра замацаваць яе пры дапамозе скотча ў трох месцах — знізу, зверху і па цэнтры. Дно цыліндра мы зафіксавалі плёнкай ад поліэтыленавага пакета і скотчам, каб гіпсавая маса не выцекла падчас застывання.

Так, як вы правільна здагадаліся, для вырабу самаробных крэйдачак патрэбны гіпс. А яшчэ акрылавыя фарбы і вада. Для таго, каб прыгатаваць каляровую масу, белы гіпсавы парашок трэба змяшаць з вадой (у прапорцыі 1:1,5 (то бок парашку больш, чым вады) і дадаць туды фарбу (колькасць залежыць ад таго, якое адценне і яркасць крэйды вы хочаце атрымаць). Можна мяшаць лыжкай, але хутчэй і весялей рукамі. Мы ў гэтым пераканаліся на ўласным досведзе. Выпэцкаліся з ног да галавы, затое шчасця колькі! Праўда,





Фота Надзеі БУЖАН.

любавацца на свае рознакаляровыя рукі мы будзем пасля. Бо цяпер нельга губляць час. Хэлен нас папярэдзіла, што гіпс застывае вельмі хутка, прыблізна хвілін 8-15. А нам жа яшчэ трэба пераліць праз лейку атрыманую каляровую масу ў загадзя падрыхтаваныя формачкі. Каб крэйдачкі атрымаліся больш вясёлымі, палову цыліндра запаўнялі адным колерам, палову — іншым. Паводле слоў Хэлен, гэта вельмі зручна рабіць, калі на майстар-клас збіраецца шмат дзяцей. Усе замешваюць гіпс адначасова і пры гэтым выбіраюць сабе фарбу любімага колеру, а потым абменьваюцца. Крэйдачкі тады атрымліваюцца наогул вясёлкавымі.

Пакуль наш рукатворны цуд сохне, мы п'ём гарбатку з печывам і дзелімся ўражаннямі. Разглядаем вырабы з гліны, якія зрабілі людзі на іншым майстар-класе — па кераміцы. Праз хвілін дваццаць Хэлен бярэ ў рукі адзін з цыліндрыкаў, які ўжо практычна цвёрды, і прапаноўвае нам дакрануцца. «Адчуваеце цяпло? Гэта ідзе хімічная рэакцыя з цеплавыдзяленнем».

Радасныя, мы забіраем гіганцкія крэйдачкі, зробленыя ўласнымі рукамі з сабой. Цяпер імі ўсё лета можна маляваць, пакуль асфальт не скончыцца! На развітанне Хэлен дае інструктаж: «Калі прыйдзеце дадому, вызваліце свае крэйдачкі з поліэтыленавага цыліндра. Занясіце на балкон і пакіньце іх там ляжаць яшчэ суткі, каб цалкам прасохлі».

Пры жаданні можна паспрабаваць зрабіць крэйдачкі і дома. Пры гэтым ад вас не патрабуецца мора часу, намаганняў і фінансавых выдаткаў. А дзіця, хутчэй за ўсё, з задавальненнем паўдзельнічае ў гэтым працэсе. Бо так прыемна гуляць з тым, што ты зрабіў сам.

А гульняў на асфальце — як дроў у лесе. Можна намаляваць «класікі», альбо зладзіць конкурс сярод дзяцей у двары на самы арыгінальны малюнак. Прапануйце сваёй малечы пагуляць разам: вы малюеце, дапусцім, хмарку, а ён — кроплі дажджу. Гэта вельмі збліжае. Таксама можна намаляваць дарогу і разметку на ёй, ці трасу са стартам і фінішам — гэта можна пасля скарыстаць падчас рухомых гульняў.

Дарэчы, самаробнымі крэйдачкамі можна маляваць не толькі на асфальце і не толькі летам. Фонам для дзіцячых малюнкаў могуць стаць нават сцены дзіцячага пакоя. Саша, напрыклад, расказала, што ім сябры падарылі чорную грыфельную дошку. Яна лёгка мацуецца да сцяны. І там Янка з Юстай з задавальненнем малююць таксама.

**Надзея ДРЫЛА.** *dryla@zviazda.by* ■

■ Маміны дзённікі

# «А ВЫ НЕ ВЕРЫЛІ!»

**Сын зламаў мне заколку для валасоў.**

**— Калі ты перастанеш псаваць рэчы? — разззлавалася я.**

**— Калі вырасту.**

☺☺☺

Укладваем Даню спаць. Пацалавалі і закрываем дзверы.

— Калі вы будзеце шумець, я да вас прыйду, — «пагразіў» сын.

☺☺☺

**Муж прывёз сына да сябе на работу.**

**— Зараз дядзька Сяргей выйдзе, ты яму скажаш "прывітанне", — папярэджвае Даню.**

**— "Прывітанне" кажуць дзеці, а мужыкі кажуць «здарова!»**

☺☺☺

Пасля навагодніх свят. Малы п'е ваду.

— За Вову! — падымае ўгору свой кубачак. — Каб ён не старэў!

☺☺☺

**Зламалі бульбачыстку. Пачалася мітусня. Мужчыны наперабой раяць, як яе адрамантаваць.**

**— Супакойцеся! — перакрыкввае ўсіх Даня. — У нас ёсць сметніца!**

☺☺☺

Калі бабуля і дзядуля ад'язджалі дадому пасля свята, Даня затрымаў іх у дзвярах:

— Стойце! Вы самы галоўны падарунак забылі, — і прынёс паштоўку, якую змайстраваў сам.

☺☺☺

**Даня знайшоў пад ёлкай шмат падарункаў, але заўважыў там і падарункі для ўсіх дарослых.**

**— Бачыце, Дзед Мароз не толькі дзецям падарункі прыносіць, але і дарослым, а вы не верылі!**

Занатавала **Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.**

***А пра што гавораць вашы дзеці? Дасылайце свае гісторыі.*** ■

*АДЗІН ТАТА ЗНАЧЫЦЬ БОЛЬШ, ЧЫМ СТО НАСТАЎНІКАЎ (ДЖОРДЖ ГЕРБЕРТ).*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.